ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

1981
4
ЧЭРВЕНЯ
ЧАЦВЕР
№ 22 (1322)
Выходзіць раз у тыдзень.

Цана 2 кап.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

"Беларускі універсітэт"

**тэлетайп**

• Учора • Сёння • Заўтра •

### НА ПАСЯДЖЭННІ

**новага саставу камітэта народнага кантролю БДУ заслуханы і абмеркаваны вынікі праверкі работы вучэбна-дапаможнага персаналу на геаграфічным, хімічным, біялагічным факультэтах; вынікі праверкі работы медпункта і паліклінікі; вынікі выканання рэкамендацый галаўной ГНК па праверцы міжгародніх тэлефонных размоў.**

**Т. САХАШЧЫК.**

### ЧЛЕН-КАРЭСПАНДЭНТ

**АН ГДР прафесар Х. Кох выступіў на чарговым пасяджэнні семінара «Алгебра і тапалогія», які вядзе на механіка-матэматычным факультэце акадэмік АН БССР У. П. Платонаў, з лекцыяй «Абагульненне лакальнай тэорыі палёў класаў».**

**М. НІЧЫПАРЭНКА.**

### ШЛЯХ АГІТПОЕЗДА

**«Дружба» з замежнымі студэнтамі, якія навучаюцца ў Белдзяржуніверсітэце, пройдзе ў час летніх канікулаў па дарогах Беларусі, Украіны, Пскоўшчыны. Замежныя сябры змогуць наведаць у ліпені—жніўні Маскву, Ленінград, Ташкент, Ерэван, Кіеў, Адэсу, Баку. Жадаючых чакаюць дамы адпачынку «Адлер», «Нарач», а таксама лагер працы і адпачынку ў саўгасе «Любань».**

**В. ЛАПІКАЎ.**

### З ШЭФСКІМ

**канцэртам у гарадскім пасёлку Крупкі на раённым свяце, прысвечаным заканчэнню пасяўных работ, выступіла універсітэцкая агітбрыгада, якой кіруе Я. С. Слуцкі, разам з фальклорна-танцавальнай групай механіка-матэматычнага факультэта і ўдзельнікамі мастацкай самадзейнасці гістфака.**

**Л. БАРАНОЎСКАЯ, інструктар студэнцкага клуба.**

### ГАСЦІННА

**расчыніў дзверы Белдзяржуніверсітэт перад сваімі былымі выхаванцамі. Выпускнікі 1971 года гістарычнага, механіка-матэматычнага факультэтаў і ФПМ прыйшлі сюды на сустрэчу з выкладчыкамі і студэнтамі, урачыста адзначаючы 10-годдзе з дня атрымання дыплома аб вышэйшай адукацыі.**

**Т. АЛЯКСАНДРАВА.**

**РЭПАРТАЖ З АБАРОНЫ**

## ДАСЛЕДУЕЦЦА ЎПЕРШЫНЮ...

Спачатку была размова са студэнтамі пятага курса гістарычнага факультэта.

— Алега Антонавіча Яноўскага, выкладчыка кафедры гісторыі СССР дасавецкага перыяду (а гэта ён сёння абараняе кандыдацкую дысертацыю) ведаем даўно. Лекцыі, якія чытае Алег Антонавіч, вызначаюцца багатым па зместу матэрыялам. Цікавая і сама тэма дысертацыі — «Працоўны ўклад моладзі вышэйшых навучальных устаноў Беларусі ў выкананне народнагаспадарчых задач IX пяцігодкі». Калі ёсць час, можаце папрысутнічаць — абарона публічная. Пачатак у 15 гадзін.

14.30. У зале пасяджэнняў вучонага савета пачынаюць збірацца выкладчыкі і студэнты гістарычнага факультэта. Заходзяць і садзяцца на першыя рады члены вучонага савета па гістарычных навуках. Калі для іх прысутнічаць на абароне — абавязак, то першыя прыйшлі, каб падтрымаць свайго калегу, старэйшага таварыша ў такі адказны для яго момант.

Старшыня савета па абароне дысертацый праэктар БДУ імя У. І. Леніна У. Р. Івашын аб'яўляе парадак пасяджэння; намеснік вучонага сакратара, прафесар А. П. Ігнаценка зачытвае біяграфічныя звесткі А. А. Яноўскага: сярэдняя школа, універсітэт, работа старшым лабарантам, а затым выкладчыкам гістарычнага факультэта. За час работы ва універсітэце ён падрыхтаваў 7 навуковых артыкулаў (адзін з іх — для Беларускай Савецкай Энцыклапедыі), быў удзельнікам шматлікіх навуковых канферэнцый. Гэта — твар маладога вучонага-даследчыка, актыўнага, працавітага, улюбёнага ў сваю справу. Іменна такія, як А. А. Яноўскі, прыходзяць сёння ў навуку, каб сказаць сваё «я». Нястомнай працай, пошукамі, знаходкамі.

Выступае А. А. Яноўскі:

— Сённяшні студэнт—будучы спецыяліст. І не сакрэт што самастойна думаць і працаваць ён вучыцца ўжо цяпер, за студэнцкай партай. Аднак не адной толькі вучобай жывуць нашы юнакі і дзяўчаты. Свой трэці, працоўны семестр, яны праводзяць у куртках байцоў СБА на БАМе і ў Карэліі, на палях Малдавіі і Беларусі, на самых разнастайных аб'ектах народнай гаспадаркі краіны. Моладзь вучыцца жыць і працаваць па-ленінску, па-камуністычнаму. Наша партыя ўдзяляе вялікую ўвагу працоўнаму выхаванню студэнтаў.

Разам з тым працоўны ўклад студэнцкай моладзі рэспублікі ў выкананне народнагаспадарчых задач яшчэ мала даследаваны з навуковага боку. Больш таго, у беларускай гістарыяграфіі гэта пытанне падрабязна яшчэ не разглядалася. Таму я і выбраў гэту тэмай кандыдацкай дысертацыі...

— Водгукі, што прыйшлі на аўтарэферат і кандыдацкую дысертацыю А. А. Яноўскага, сведчаць аб наступным: даследчык заслугоўвае права на атрыманне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук, — гаворыць намеснік вучонага сакратара, прафесар А. П. Ігнаценка.— Сярод рэцэнзентаў — гістарычны факультэт універсітэта, Інстытут гісторыі партыі пры ЦК КПБ, Мінскі інстытут культуры, ЦК ЛКСМБ. У рабоце шмат цікавых і карысных фактаў. Значная заслуга ў гэтым навуковага кіраўніка дацэнта А. І. Кажушкова.

Такой жа думкі і апаненты —дэкан гістарычнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна прафесар І. І. Царук, загадчык кафедры гісторыі СССР, БССР і замежных краін Мінскага інстытута культуры М. К. Сакалоў.

...Здаючы гэты рэпартаж у нумар, убачыў на рэдакцыйным стале віншаванне ў адрас супрацоўнікаў універсітэта, якія ў красавіку — маі абаранілі кандыдацкія дысертацыі. Сярод шматлікіх прозвішчаў прачытаў знаёмае: А. А. Яноўскі, гістарычны факультэт.

**А. ЛАЗОЎСКІ.**

**НА ЗДЫМКАХ:** дысертацыю абараняе **А. А. ЯНОЎСКІ.**

Фота В. Шачака.





**АПЕРАЦЫЯ «АБІТУРЫЕНТ-81»**

## Клопат—будучым калегам

**ЗАКОНЧЫЦЦА летняя сесія, і раз'едуцца пасля экзаменаў студэнты: хто на практыку, хто ў будатрад. А на замену ім у інтэрнаты і аўдыторыі прыйдуць тыя, хто толькі марыць яшчэ аб універсітэцкай адукацыі. І каб дапамагчы абітурыентам хутчэй адаптавацца ў нязвыклай абстаноўцы ўступных экзаменаў, камітэт камсамола БДУ імя У. І. Леніна кожны год арганізуе грамадскую прыёмную камісію. Аб сваёй рабоце расказвае адказная за яе стварэнне ў гэтым годзе сакратар камітэта камсамола філалагічнага факультэта Таццяна Сотчанка:**

— Грамадская прыёмная камісія, галоўны памочнік універсітэцкай прыёмнай камісіі, была створана яшчэ ў снежні мінулага года. Для ўдзелу ў ёй былі запрошаны па 4—5 чалавек з кожнага факультэта. Галоўнай нашай задачай у падрыхтоўчы перыяд стала прапаганда звестак аб універсітэце. Мы дапамагалі праводзіць на факультэтах «Дні адкрытых дзвярэй», рассылалі брашуры аб БДУ, выступалі ў школах, вучылішчах і тэхнікумах з гутаркамі аб сваёй навучальнай установе. З нашай дапамогай кожны факультэт падрыхтаваў для абітурыентаў насценную газету.

Мы збіраемся разам кожную сераду, абмяркоўваем зробленае за тыдзень, удакладняем задачы. З 1 ліпеня мы будзем дапамагаць юнакам і дзяўчатам правільна афармляць дакументы, уладкоўваць іх у інтэрнаты, вырашаць кожны дзень шэраг будзённых, але неабходных пытанняў, разумеючы, што сярод іх няма дробязей, а нашы абавязкі — часцінка дакладнай работы па прыёму новага папаўнення ў Белдзяржуніверсітэт.

Запісаў **Л. ВАШКО, студэнт журфака.**

**ВЕЧАР ПАЭЗІІ**

## ЗАЛАТЫЯ КРУПІНКІ

ТВОРЧАСЦІ паэта Анатоля Сербантовіча быў прысвечаны вечар «А над песняю той недапетай...», які арганізавалі члены гуртка беларускай літаратуры філалагічнага факультэта. Яго адкрыў студэнт Сяргей Кавалёў. У сваім дакладзе «Залатыя крупінкі А. Сербантовіча» ён расказаў пра творчасць паэта, яго жыццёвы шлях. Пасля прагучала паэма «Мінае поле», якую чыталі члены літаратурнага гуртка студэнты М. Карпечанка, І. Босы, В. Вашчанчук, Г. Дзямешчык.

Дацэнт У. А. Навумовіч вёў размову пра апошні зборнік вершаў А. Сербантовіча «Пярсцёнак», пра яго вянкі санетаў «Васілёк», «Курганы», «Салдат», пра яго балады.

Паэт Мікола Чарняўскі, госць філалагаў, асабіста ведаў маладога паэта. Ён успомніў студэнцкія гады Анатоля Сербантовіча, прачытаў вершы з першай кніжкі «Азбука».

І ў канцы літаратурнага вечара загадчыца кафедры беларускай літаратуры В. В. Казлова шчыра падзякавала ўсім за светлыя ўспаміны пра паэта.

**С. ЧЫГРЫН, студэнт філфака.**

# УМОВЫ

## I. ВІДЫ СПАБОРНІЦТВА І ЯГО ЎДЗЕЛЬНІКІ

1. На званне «Лепшы факультэт Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна».

У спаборніцтве прымаюць удзел калектывы ўсіх факультэтаў універсітэта і ІПК.

2. На званне «Лепшае навуковае падраздзяленне Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна».

У спаборніцтве прымаюць удзел калектывы НДІ ФХП, НДІ ПФП, ВЦ, СКТБ з ВВ, сацыялагічная лабараторыя.

3. На званне «Лепшая агульнауніверсітэцкая кафедра грамадскіх навук Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна».

У спаборніцтве прымаюць удзел калектывы ўсіх грамадскіх агульнауніверсітэцкіх кафедр.

4. На званне «Лепшая агульнауніверсітэцкая кафедра замежных моў Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна».

У спаборніцтве прымаюць удзел калектывы кафедр англійскай мовы прыродазнаўчых і гуманітарных факультэтаў, нямецкай мовы, французскай мовы.

5. На званне «Лепшае вытворчае падраздзяленне Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна».

У спаборніцтве прымаюць удзел калектывы вучгаса «Шчамысліца», друкарні, выдавецтва БДУ.

## II. ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ СПАБОРНІЦТВА

Падвядзенне вынікаў сацспаборніцтва адбываецца на аснове распрацаваных і зацверджаных крытэрыяў для ўсіх падраздзяленняў. Крытэрыі ўлічваюць вучэбную, метадычную, выхаваўчую, навуковую, вытворчую і грамадскую дзейнасць за справаздачны каляндарны год.

Вызначаюцца ўсе месцы з першага да апошняга.

1. Усе ўдзельнікі спаборніцтва—падраздзяленні Белдзяржуніверсітэта — прадстаўляюць да 25 снежня бягучага года поўныя звесткі аб выкананні ўзятых сацабавязацельстваў і праект абавязацельстваў на прадстаячы год па ўстаноўленай форме.

2. Прадстаўленыя матэрыялы апрацоўваюцца вытворчай камісіяй мясцовага камітэта да 10 студзеня і зацвярджаюцца камісіяй па сацспаборніцтву Белдзяржуніверсітэта, якая выносіць канчатковае рашэнне.

3. Падвядзенне вынікаў сацспаборніцтва і ўзнагароджанне пераможцаў адбываецца на ўрачыстым сходзе прадстаўнікоў падраздзяленняў Белдзяржуніверсітэта.

## III. УЗНАГАРОДЖАННЕ ПЕРАМОЖЦАЎ

1. Пераможцу ў спаборніцтве на званне «Лепшы факультэт Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна» прысуджаецца пераходны Чырвоны сцяг і грамата рэктарата, парткома, мясцкома, камітэта камсамола БДУ;

— калектыў, які заняў другое месца, узнагароджваецца граматай рэктарата, парткома, мясцкома і камітэта камсамола БДУ;

— калектыў, які заняў трэцяе месца, узнагароджваецца граматай рэктарата, парткома, мясцкома і камітэта камсамола БДУ.

2. Пераможцу ў спаборніцтве на званне «Лепшае навуковае падраздзяленне Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна» прысуджаецца пераходны вымпел і грамата рэктарата, парткома, мясцкома і камітэта камсамола БДУ.

3. Пераможцу ў спаборніцтве на званне «Лепшая агульнауніверсітэцкая кафедра грамадскіх навук» прысуджаецца пераходны вымпел і грамата рэктарата, парткома, мясцкома і камітэта камсамола БДУ.

4. Пераможцу ў спаборніцтве на званне «Лепшая агульнауніверсітэцкая кафедра замежных моў» прысуджаецца пераходны вымпел і грамата рэктарата, парткома, мясцкома і камітэта камсамола БДУ.

5. Пераможцу ў спаборніцтве на званне «Лепшае вытворчае падраздзяленне Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна» прысуджаецца пераходны вымпел і грамата рэктарата, парткома, мясцкома і камітэта камсамола БДУ.

6. Вызначэнне пераможцаў унутры падраздзяленняў адбываецца рашэннем адміністрацыі, партыйнай, прафсаюзнай і камсамольскай арганізацый падраздзяленняў у канцы снежня штогод.

## МЕТОДЫКА

Методыка прызначана для правядзення параўнальнай ацэнкі работы факультэтаў, навуковых падраздзяленняў і агульнауніверсітэцкіх кафедр.

Параўнальная ацэнка праводзіцца адзін раз у год пры падвядзенні вынікаў работы асобна па факультэтах, навуковых установах і агульнауніверсітэцкіх кафедрах. Прымяняльна да гэтай методыкі факультэты праводзяць параўнальную ацэнку кафедр, а навуковыя ўстановы — лабараторый (аддзелаў).

Для параўнальнай ацэнкі работы выкарыстоўваюцца паказчыкі, якія характарызуюць яе ўзровень і аб'ём, інтэнсіўнасць удзелу ўсяго навукова-педагагічнага калектыву ў навуковых даследаваннях, укараненне вынікаў даследаванняў у народную гаспадарку, эканамічную эфектыўнасць выконваемых даследаванняў, падрыхтоўку педагагічных і навуковых кадраў, стан студэнцкай навуковай работы, грамадска-палітычную актыўнасць супрацоўнікаў і студэнтаў. У некаторых паказчыках, якія аб'ядноўваюць неаднолькавыя работы, уведзены ўнутраныя множнікі для якаснага параўнання выконваемых работ.

Калі паказчык разлічваецца на адну планавую (укаранёную) тэму, то пад гэтым падразумяваюцца, дзе гэта спецыяльна агаворана, дзяржбюджэтныя (у т. л. кафедральныя) і гасдагаворныя НДР, на агульную колькасць якіх і дзеліцца абсалютная велічыня паказчыка.

Пад тэрмінам «навукова-педагагічны састаў» падразумяваюцца педагагічныя кадры (прафесары, дацэнты, старшыя выкладчыкі, выкладчыкі, асістэнты) і навуковыя работнікі (старшыя і малодшыя навуковыя супрацоўнікі, у т. л. навуковыя работнікі, якія выконваюць НДР па гасдагаворах).

Усе паказчыкі разбіты на два тыпы. Паказчыкі першага тыпу — такія, планаванне якіх з-за наяўнасці знешніх фактараў немагчыма. Па гэтых паказчыках улічваюцца толькі вынікі работы. Другі тып паказчыкаў ахоплівае такія віды работ, планаванне якіх магчыма з дакладнасцю. Пры ацэнцы вынікаў па другому тыпу паказчыкаў улічваецца не толькі колькасць выкананых работ, але і прынятае абавязацельства. Для гэтага прымяняецца спецыяльная формула, мэта выкарыстання якой заключаецца ў тым, каб стымуляваць выкананне і прыняцце напружаных абавязацельстваў; недавыкананне прыводзіць да страты балаў, а значнае перавыкананне (адпаведнае, як правіла, заніжаным абавязацельствам) нязручна. Падставай для такога падліку служыць тое, што ва ўмовах ВНУ, пры адсутнасці агульных нарматываў, лепшым нарміроўшчыкам з'яўляецца сам калектыў падраздзялення.

Ацэнка эфектыўнасці работы падраздзяленняў па кожнаму з паказчыкаў праводзіцца па наступнай схеме. Няхай **А** — абавязацельства па данаму паказчыку, **В** — фактычна выканана, **Б** — балы.

Для паказчыкаў першага тыпу, планаванне якіх немагчыма, бярэцца **Б=В.**

Для паказчыкаў другога тыпу, якія плануюцца з некаторай дакладнасцю, прымяняюцца формулы:

$$Б=\frac{В^2}{А}-0{,}1\,(А-В)$$ — пры недавыкананні,

$$Б=2{,}2\,А-1{,}2\,\frac{А^2}{В}$$ — пры перавыкананні.

Калі абавязацельства не бралася **(А=0)**, то, незалежна ад выканання, падраздзяленні займаюць месцы за тымі, хто ўзяў абавязацельства, адпаведна з дасягнутымі рэзультатамі.

**Прыклад 1.**

Прымяненне ўказаных формул дае наступныя вынікі:

працэнт выканання абавязацельстваў: 0:20:50:80:90:99:100::105:110:120:150:180:200:300

атрыманыя балы ў працэнтах: —10:—4:20:62:80:98:100::105,9:118:120,0:140,0:154,0:160::180

Такім чынам, поўнае невыкананне караецца стратай балаў у 110 працэнтаў, а перавыкананне ў два разы (пры заніжаных абавязацельствах) дае толькі 160 балаў замест 200 працэнтаў.

Калектывам падраздзяленняў дазваляецца да 1 красавіка і да 1 ліпеня справаздачнага года прыняць дадатковыя, павышаныя абавязацельствы, прычым сумарнае перавышэнне дадатковых абавязацельстваў над зыходнымі не павінна перавышаць 50 працэнтаў.

Абавязацельствы кожнага падраздзялення лк асноўныя, так і дадатковыя, даводзяцца мясцкомам да ведама ўсіх удзельнікаў спаборніцтва.

Наступны крок складаецца з вылічэння адноснай інтэнсіўнасці работы падраздзяленняў па кожнаму паказчыку. Для гэтага балы, набраныя кожным падраздзяленнем, падзяляюцца на максімальную ў даным паказчыку колькасць балаў. Гэтыя лічбы, якія абазначаюцца **И**, памнажаюцца на каэфіцыент **К** складанасці або важнасці паказчыка. Атрыманыя ў выніку ачкі **0** сумiруюцца па ўсіх паказчыках. У залежнасці ад сумы ачкоў размяркоўваюцца месцы падраздзяленняў па кожнаму з відаў работ.

**Прыклад 2.**

| Падраздзяленне | | 1 | 2 | 3 |
|---|---|---|---|---|
| К=3 | Б | 16 | 27 | 5 |
| | И | 0,59 | 1 | 0,18 |
| | О | 1,77 | 3 | 0,55 |
| К=1,5 | Б | 49 | 30 | 36 |
| | И | 1 | 0,61 | 0,73 |
| | О | 1,5 | 0,91 | 1,09 |
| Сума | | 3,27 | 3,91 | 1,64 |
| Месцы | | 2 | 1 | 3 |

Для вызначэння агульнага месца падраздзялення па ўсіх відах работ прымяняецца той жа прынцып параўнання інтэнсіўнасцей па ўсіх раздзелах. Агульнае месца падраздзялення вызначаецца па суме месц, атрыманых па відах дзейнасці.

## ПАКАЗЧЫКІ ПАДВЯДЗЕННЯ ВЫНІКАЎ САЦСПАБОРНІЦТВА НА ЗВАННЕ «ЛЕПШЫ ФАКУЛЬТЭТ БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА»

### Раздзел І. Кадры, павышэнне кваліфікацыі

1. Змена колькаснасці прафесараў у працэнтах за справаздачны год — 1,1
2. Змена колькаснасці дацэнтаў у працэнтах за справаздачны год — 1,0
3. Абароны доктарскіх дысертацый. Колькасць абарон адносна колькасці кандыдатаў навук — 2,0
4. Абароны кандыдацкіх дысертацый. Колькасць абарон адносна лічбы супрацоўнікаў з вышэйшай адукацыяй без ступені — 1,1
5. Абароны дысертацый аспірантамі ў тэрмін. Колькасць абарон адносна плана выпуску ў справаздачным годзе — 1,2
6. Выкананне плана прыёму ў аспірантуру ў працэнтах — 1,0
7. Выкананне плана выпуску спецыялістаў у працэнтах — 1,0
8. Накіравана выкладчыкаў на стажыроўку і павышэнне кваліфікацыі ў працэнтах — 1,0

### Раздзел ІІ. Вучэбна-метадычная работа

1[ж] Колькасць дыпломаў з адзнакай адносна колькасці абараняўшых дыпломы — 1,2

2. Рэкамендавана дыпломных работ да друку або ўкаранення адносна колькасці абараняўшых дыпломы — 1,0

3[ж] Забяспечанасць тэхналагічнымі картамі (працэнт) — 1,0

4. Месца, занятае факультэтам у аглядзе-конкурсе тэхнічных сродкаў навучання — 1,0

5[ж] Выдана падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў: колькасць друкаваных аркушаў адносна колькасці выкладчыкаў — 1,3
- а) з грыфам Мінвуза СССР ×3
- б) з грыфам Мінвуза БССР ×2
- в) без грыфа ×1

6[ж] Колькасць апублікаваных навукова-метадычных артыкулаў адносна колькасці выкладчыкаў — 1,1

7[ж] Даклады на навукова-метадычных канферэнцыях адносна колькасці выкладчыкаў — 1,0
- а) міжнародных ×3
- б) Усесаюзных, рэспубліканскіх ×2
- в) універсітэцкіх ×1

8[ж] Арганізацыя канферэнцый. Колькасць канферэнцый адносна колькасці супрацоўнікаў з вышэйшай адукацыяй — 1,2
- а) усесаюзных (занальных) ×2
- б) рэспбуліканскіх ×1

9. Колькасць экспанатаў вучэбна-метадычнага характару на ВДНГ адносна агульнай колькасці супрацоўнікаў — 1,3
- а) ВДНГ СССР ×3
- б) ВДНГ БССР ×1

10. Колькасць узнагарод на выстаўках адносна агульнай колькасці супрацоўнікаў — 1,2

### Раздзел ІІІ. Навукова-даследчая работа

1. Колькасць тэм па пастановах урада, ДКНТ адносна агульнай колькасці тэм — 1,2
2. Колькасць тэм па планах АН СССР і АН БССР адносна агульнай колькасці тэм — 1,1
3. Колькасць тэм па праблемах вышэйшай школы адносна агульнай колькасці тэм — 1,2
4. Атрыманне прэмій — 2,0
   - саюзнай прэміі ×3
   - рэспубліканскай прэміі ×2
   - дыплома на адкрыццё ×5
5. Колькасць атрыманых патэнтаў ×2, прададзеных ліцэнзій ×1 адносна агульнай колькасці супрацоўнікаў — 1,5

6[ж] Колькасць пададзеных заяў на вынаходніцтвы агульнай колькасці супрацоўнікаў — 1,5
- а) міжнародных ×5
- б) усесаюзных ×3
- в) рэспбуліканскіх ×1

7. Колькасць станоўчых рашэнняў адносна агульнай колькасці супрацоўнікаў — 1,3

8. Арганізацыя праблемнай або галіновай лабараторыі — 2,0

9. Колькасць узнагарод на выстаўках адносна агульнай колькасці супрацоўнікаў — 1,6
- а) міжнародных ×3
- б) ВДНГ СССР ×2
- в) ВДНГ БССР ×1

10[ж] Колькасць выдадзеных манаграфій, даведнікаў, атласаў, слоўнікаў. Друкаваных аркушаў адносна колькасці навукова-педагагічных работнікаў — 1,2

11[ж] Колькасць апублікаваных артыкулаў адносна колькасці навукова-педагагічных работнікаў — 1,0

12. Эфектыўнасць НДР. Эканамічны эфект адносна затрат на навуку — 2,0

13[ж] Правядзенне канферэнцый — 1,3
- а) міжнародных ×3
- б) усесаюзных ×2
- в) рэспубліканскіх ×1

адносна колькасці супрацоўнікаў.

14[ж] Колькасць дакладаў, прачытаных на канферэнцыях — 1,0
- а) міжнародных ×3
- б) усесаюзных ×2
- в) рэспубліканскіх ×1

### Раздзел IV. Навукова-даследчая работа студэнтаў

1. Колькасць студэнцкіх работ, якія адзначаны ўзнагародамі конкурсаў — 1,2
- а) усесаюзных ×4
- б) рэспубліканскіх ×3
- І катэгорыі ×3
- ІІ катэгорыі ×2
- ІІІ катэгорыі ×1

# САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА Ў БЕЛАРУСКІМ ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНЫМ УНІВЕРСІТЭЦЕ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА Ў ХІ ПЯЦІГОДЦЫ

адносна агульнай колькасці студэнтаў.

2 ж Колькасць студэнтаў, сааўтараў навуковых работ (у т. л. справаздач па НДР) адносна агульнай колькасці студэнтаў 1,5

3 ж Колькасць дакладаў студэнтаў на канферэнцыях 1,0

а) усесаюзных ×10

б) рэспубліканскіх ×4

в) універсітэцкіх ×1

адносна агульнай колькасці студэнтаў.

**Раздзел V.**

**Грамадска-палітычная работа**

1 ж Публікацыя навукова-папулярных артыкулаў у перыядычным друку адносна колькасці супрацоўнікаў з вышэйшай адукацыяй 1,0

2 ж Лекцыі, прачытаныя на грамадска-палітычныя тэмы, адносна колькасці студэнтаў з вышэйшай адукацыяй 1,0

3. Месца ў аглядзе-конкурсе насценнага друку 1,0

4. Месца ў аглядзе-конкурсе нагляднай агітацыі 1,0

5. Работа СБА (агляд-конкурс) 1,0

6. Работа СГА (агляд-конкурс) 1,0

7. Агляд-конкурс штогадовай спартакіяды 1,0

8. Колькасць выбарных пасад, якія займаюць супрацоўнікі факультэта, адносна агульнай колькасці студэнтаў 1,0

9 Агляд-конкурс тэхнікі бяспекі 1,0

10. Колькасць парушэнняў правілаў паводзін адносна агульнай колькасці студэнтаў і супрацоўнікаў —1,5

## ПАКАЗЧЫКІ ПАДВЯДЗЕННЯ ВЫНІКАЎ САЦСПАБОРНІЦТВА НА ЗВАННЕ «ЛЕПШАЯ АГУЛЬНАУНІВЕРСІТЭЦКАЯ КАФЕДРА БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА»

**Раздзел І.**
**Кадры, павышэнне кваліфікацыі**

1. Змена колькаснасці прафесараў у працэнтах за справаздачны год 1,1

2. Змена колькаснасці дацэнтаў у працэнтах за справаздачны год 1,0

3. Абароны доктарскіх дысертацый. Колькасць абарон адносна колькасці кандыдатаў навук 2,0

4. Абароны кандыдацкіх дысертацый. Колькасць абарон адносна колькасці супрацоўнікаў з вышэйшай адукацыяй без ступені 1,1

5. Абароны дысертацый аспірантамі ў тэрмін. Колькасць абарон адносна плана выпуску ў справаздачным годзе 1,2

6. Выкананне плана прыёму ў аспірантуру ў працэнтах 1,0

7. Выкананне плана выпуску спецыялістаў у працэнтах 1,0

8. Накіравана выкладчыкаў на стажыроўку і павышэнне кваліфікацыі ў працэнтах 1,0

**Раздзел ІІ.**
**Вучэбна-метадычная і выхаваўчая работа**

1 ж Забяспечанасць тэхналагічнымі картамі дысцыплін, якія вывучаюцца 1,0

колькасць лекцыйных курсаў, забяспечаных ТК
лекцыйных курсаў усяго

2 ж Распрацоўка новага лекцыйнага курса 1,0

Колькасць курсаў
Колькасць лектараў

3 ж Выданне падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў 1,5

а) з грыфам Мінвуза СССР ×3

друк. аркушаў
выкладчыкаў

б) з грыфам Мінвуза БССР ×2

в) унутрыуніверсітэцкіх дапаможнікаў ×1

4 ж Публікацыя навукова-метадычных артыкулаў 1,0

колькасць
выкладчыкі + аспіранты

5 ж Даклады на навукова-метадычных канферэнцыях і семінарах 1,0

а) міжнародных ×3

колькасць
выкладчыкі + аспіранты

б) усесаюзных ×2

в) рэспубліканскіх ×1

6 ж Арганізацыя і правядзенне канферэнцыі навукова-метадычнага характару 1,5

а) усесаюзнай ×2

колькасць
суправ. з вышэйш. адук.

б) рэспубліканскай ×1

7. Курыраванне работ навукова-метадычнага семінара 1,0

а) рэспубліканскага ×4

колькасць
выкладчыкаў

б) гарадскога ×2

в) універсітэцкага ×1

8. Работа ў вячэрнім універсітэце марксізму-ленінізму 1,0

колькасць
выкладчыкаў

9. Удзел экспанатаў вучэбна-метадычнага характару на колькасць супрацоўнікаў 2,0

а) ВДНГ СССР ×3

б) ВДНГ БССР ×1

10. Атрыманне медаля або дыплома за экспанат вучэбна-метадычнага характару 2,0

а) ВДНГ СССР ×3

колькасць
супрацоўнікаў

б) ВДНГ БССР ×1

**Раздзел ІІІ.**
**Навуковая работа**

1. Колькасць тэм, выконваемых па пастановах урада, дырэктыўных органаў, каардынацыйных планах АН СССР, АН БССР, у разліку на адну планавую тэму 2,0

2. Колькасць гасдагаворных работ у разліку на адну выконваемую тэму (у тым ліку дагаворы аб сацыяльным развіцці) 2,0

3. Атрыманне саюзнай або рэспубліканскай прэміі 4,0

колькасць
супрацоўнікаў

4. Колькасць работ, за якія атрыманы ўзнагароды (медалі, дыпломы, граматы), усесаюзныя (4), рэспубліканскія (3), галіновыя ў разліку на аднаго супрацоўніка (2) 2,0

5 ж Колькасць манаграфій, апублікаваных супрацоўнікамі 2,0

колькасць друкаваных аркушаў
супрацоўнікаў

6 ж Колькасць навуковых артыкулаў, апублікаваных супрацоўнікамі 1,0

колькасць
супрацоўнікаў

7 ж Колькасць брашур, апублікаваных супрацоўнікамі 2,0

колькасць
супрацоўнікаў

8 ж Колькасць канферэнцый, якія праводзяцца на базе універсітэта 2,0

а) усесаюзных ×2

колькасць
супрацоўнікаў

б) рэспубліканскіх ×1

9 ж Колькасць студэнцкіх навуковых работ, прадстаўленых на: 2,0

а) універсітэцкай канферэнцыі

колькасць
выкладчыкаў ×1

б) рэспубліканскі агляд

колькасць
выкладчыкаў ×3

10. Колькасць узнагарод, атрыманых за студэнцкія навуковыя работы 3,0

а) рэспубліканскі агляд

1) колькасць І катэгорыі.
супрацоўнікаў ×3

2) колькасць ІІ катэгорыі
супрацоўнікаў ×2

3) колькасць ІІІ катэгорыі
супрацоўнікаў ×1

**Раздзел V.**
**Грамадска-палітычная работа**

1. Выступленне на радыё, тэлебачанні або публікацыя артыкулаў аб кафедры, універсітэце, у газетах і часопісах 3,0

колькасць
супрацоўн. з вышэйш. адук.

2 ж Лекцыі на міжнародныя і палітычныя тэмы (акрамя прачытаных у інтэрнаце) 1,0

колькасць
супрацоўн. з вышэйш. адук.

3. Грамадская актыўнасць супрацоўнікаў, якія маюць пастаянныя грамадскія даручэнні на факультэтах і вышэй 1,0

колькасць маючых даручэнні
усіх супрацоўнікаў

4. Кіраўніцтва метадалагічнымі семінарамі ў сетцы палітасветы 1,0

колькасць кіраўнікоў
выкладчыкаў

5. Атрыманне ўзнагарод за ўдзел у лекцыйна-прапагандысцкай рабоце 4,0

а) грамата Мінвуза БССР ×3

колькасць
выкладчыкаў

б) грамата гаркома КПБ ×2

в) грамата таварыства «Веды» ×1

**Заўвага: паказчыкі, адзначаныя літарай ж, абавязковыя для планавання.**

Усе заўвагі і прапановы накіроўваць у мясцовы камітэт (галоўны корпус, п. 337).

# ЛЕТАПІС БДУ

(Пачатак у №№ 4, 6, 7, 8, 10—21).

**1972 год**

**Студзень**

Выступленне на агульнауніверсітэцкім партыйным сходзе з дакладам «Вынікі лістападаўскага Пленума ЦК КПСС, III сесіі Вярхоўнага Савета СССР і задачы камуністаў» члена ЦК КПСС, Старшыні Савета Міністраў БССР Ц. Я. Кісялёва.

**Сакавік**

Стварэнне савета па навукова-даследчай рабоце студэнтаў.

Урачысты сход, прысвечаны 50-годдзю камсамольскай арганізацыі універсітэта. Узнагароджанне арганізацыі памятным Чырвоным сцягам ЦК ЛКСМБ.

**Снежань**

Узнагароджанне універсітэта за поспехі, дасягнутыя ў рэспубліканскім сацыялістычным спаборніцтве ў гонар 50-годдзя СССР Юбілейнай Ганаровай граматай ЦК КПБ, Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, Савета Міністраў БССР і Белсаўпрофа.

**1973 год**

**Студзень**

Ва універсітэце пры ўручэнні Юбілейнай Ганаровай граматы ЦК КПБ, Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, Савета Міністраў БССР і Белсаўпрофа з прамовай выступіў другі сакратар ЦК КПБ А. Н. Аксёнаў.

Арганізацыя педагагічных атрадаў для работы ў домакіраўніцтвах г. Мінска.

**7—10 чэрвеня**

Падпісанне рабочай праграмы супрацоўніцтва Беларускага і Ягелонскага (ПНР) універсітэтаў на 1973—1975 гг.

**1 верасня**

Створаны інстытут павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў грамадскіх навук вышэйшых навучальных устаноў.

**1974 год**
**23 студзеня**

Сустрэча ва універсітэце з лётчыкам-касманаўтам СССР П. І. Клімуком.

**Верасень**

Першая савецка-балгарская навуковая студэнцкая канферэнцыя.

**Лістапад**

Святкаванне 40-годдзя гістарычнага факультэта. Урачысты вечар у клубе імя Ф. Э. Дзяржынскага.

**Снежань**

Святкаванне 30-годдзя факультэта журналістыкі. Вечар у Доме мастацтваў.

Узнагароджанне СНТ БДУ Ганаровай граматай Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і ЦК ВЛКСМ.

**1975 год**

**Зіма**

Пачаў работу першы ва універсітэце зімовы студэнцкі будаўнічы атрад.

**12 сакавіка**

Пачатак работы на геаграфічным факультэце з'езда Геаграфічнага таварыства Беларусі.

**Сакавік**

Сустрэча ва універсітэце з удзельнікамі Усесаюзнай нарады пісьменнікаў і крытыкаў «Бессмяротны подзвіг народа ў Вялікай Айчыннай вайне».

**Кастрычнік**

Наведанне універсітэта ганаровым госцем III фестывалю дружбы моладзі СССР і НРБ членам Палітбюро ЦК БКП, старшынёй Усенароднага камітэта балгара-савецкай дружбы Цолай Драгойцавай.

**Лістапад**

Споўнілася 50 гадоў першага выпуску студэнтаў БДУ. 29 лістапада адбыўся ўрачысты вечар, прысвечаны гэтай падзеі.

Стварэнне эксперыментальнай вылічальнай навучаючай сістэмы (БДУ—ЭВНС-75). Гэта першая ў СССР сістэма з экраннымі пультамі.

**26 снежня**

Узнагароджанне універсітэта за шматгадовую і плённую работу па камуністычнаму выхаванню моладзі, прыцягненне яе да актыўнай працоўнай дзейнасці ў студэнцкіх будаўнічых атрадах, высокія паказчыкі ў вучэбнай, вытворчай і грамадска-палітычнай дзейнасці Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

**Снежань**

Здадзены пад засяленне 13-павярховы інтэрнат на вул. Кастрычніцкай.

Пры БДУ створана спецыяльнае канструктарскае бюро з вопытнай вытворчасцю (СКТБ з ВВ).

За пяцігодку універсітэт падрыхтаваў і выпусціў 14 558 высокакваліфікаваных спецыялістаў па 15 спецыяльнасцях, у тым ліку 8476 — па дзённай, 2337 — па вячэрняй і 3735 — па завочнай формах навучання.

За пяцігодку ва універсітэце 43 чалавекі абаранілі доктарскія і 236 чалавек — кандыдацкія дысертацыі. Агульны аб'ём навуковай прадукцыі за пяцігодку склаў 539 назваў, у тым ліку манаграфій—195, 69 зборнікаў навуковых прац, 183 вучэбныя дапаможнікі і падручнікі. Праведзена 8 навуковых канферэнцый саюзнага і 11— рэспубліканскага значэння.

**1976 год**

**Люты**

Стварэнне пры камітэце камсамола савета маладых вучоных універсітэта.

**Чэрвень**

Адкрыццё радыёфізічнага факультэта.

**Лета**

Упершыню студэнты універсітэта выязджалі на будаўніцтва Байкала-Амурскай магістралі.

(Працяг будзе).



# МАЙСКІ «ЗАЛІК»

ГЭТЫЯ спаборніцтвы можна параўнаць з залікам. Са своеасаблівым залікам на спартыўную сталасць і падрыхтаванасць яго удзельнікаў — спартсменаў з адзінаццаці факультэтаў, якія два дні спрачаліся за званне мацнейшага. Спрачаліся дастойна, па ўсіх законах яе Вялікасці «Каралевы спорту».

Адразу пасля ўрачыстага адкрыцця спаборніцтваў у барацьбу за вышэйшыя ўзнагароды ўступілі спрынтэры. У дзяўчат стометроўку хутчэй за ўсіх прабегла прызнаны лідэр на гэтай дыстанцыі пяцікурсніца хімічнага факультэта Ірына Чурсіна (12,5 секунды). Другое і трэцяе месцы падзялілі дзве Таццяны — Кіцічэнка (3 курс, біяфак) і Апанасевіч (1 курс, гістфак). Іх час — 13 секунд роўна.

У мужчын у гэтым відзе праграмы вызначыліся адразу два пераможцы — пяцікурснік біялагічнага факультэта Уладзімір Ціток і трэцякурснік факультэта радыёфізікі і электронікі Андрэй Герман (11,4 секунды). «Бронза» дасталася Юрыю Лучко (3 курс, мехмат) — 11,5 секунды.

На чатырохсотметровай дыстанцыі ў мужчын перамог Сяргей Багданчук (3 курс, мехмат) — 52,4 секунды.

Сярод жанчын у кіданні кап'я вызначылася Ганна Тавароўская — 42 метры 52 сантыметры, а ў сектары па скачках у вышыню Галіна Мыш'янава (1 курс, ФПМ)—165 сантыметраў. Таццяна Апанасевіч, якая, як ужо адзначалася вышэй, стала прызёрам на стометроўцы, прынесла камандзе гістфака яшчэ адну перамогу— яна была лепшай сярод прыгуноў у даўжыню — 5 метраў 21 сантыметр.

У заключным відзе праграмы, эстафеце 4×100, у жанчын перамаглі гісторыкі, а ў мужчын — радыёфізікі.

А вось як выглядае канчатковая табліца камандных вынікаў (побач з назвай факультэта—колькасць набраных ачкоў):

| | | |
|---|---|---|
| 1. | Мехмат | 389.0 |
| 2. | Гістфак | 306.8 |
| 3. | ФПМ | 273.0 |
| 4. | Фізфак | 255.0 |
| 5. | Юрфак | 247.5 |
| 6. | Радыёфізікі і электронікі | 235.8 |
| 7. | Хімфак | 154.0 |
| 8. | Біяфак | 107.5 |
| 9. | Геафак | 71.8 |
| 10. | Філфак | 68.8 |
| 11. | Журфак | 29.5 |

За апошнія гады ў выступленнях факультэцкіх лёгкаатлетычных каманд склалася даволі трывалая чацвёрка лідэраў. Гэта мехмат, гістфак, ФПМ і фізфак. Прычым каманда мехмата даволі працяглы час упэўнена ўзначальвае гэты спіс. Так было, напрыклад, і на зімовым першынстве універсітэта па лёгкай атлетыцы. Гэта сведчыць аб высокай стабільнасці ў выступленнях мехматаўцаў, іх выдатнай арганізаванасці і падрыхтаванасці. Добрага слова заслугоўваюць гісторыкі і студэнты ФПМ.

Як і раней, асаблівую трывогу выклікаюць вынікі ў спаборніцтвах па тэхнічных відах лёгкаатлетычнай праграмы — кап'ё мужское, трайны скачок, кіданне дыска і молата. Дастаткова адзначыць, што універсітэцкаму рэкорду ў кіданні кап'я 24 гады, а ў трайным скачку — 20 гадоў. Каментарый, як кажуць, не патрэбен.

**С. ЛЫСКАВЕЦ.**

**НА ЗДЫМКАХ: імгненні першынства па лёгкай атлетыцы.**

**Фота І. Бардзіян.**







# Экспрэс-інфармацыя

АДБЫЛОСЯ чарговае пасяджэнне праўлення спартыўнага клуба БДУ імя У. І. Леніна. На ім разглядаўся шэраг пытанняў фізкультурна-масавай работы, якая была праведзена ва універсітэце за гэты навучальны год. Так, адзначалася, што па стану на 25 мая 1981 года кафедрай фізічнага выхавання і спорту падрыхтаваны: 1 майстар спорту СССР, 17 кандыдатаў у майстры спорту, 74 першаразраднікі і звыш 4 тысяч спартсменаў масавых разрадаў.

На пасяджэнні таксама былі заслуханы і абмеркаваны справаздачы старшынь саветаў спартыўных бюро геаграфічнага факультэта і факультэта журналістыкі аб праведзенай у справаздачны перыяд рабоце.

У заключэнне вырашалася пытанне аб выдзяленні пуцёвак у спартыўна-аздараўленчы лагер «Нарач».

* * *

ВІНШУЕМ зборную каманду універсітэта па баскетболу, якая заняла першае месца ў гарадскіх спаборніцтвах, прысвечаных памяці Героя Савецкага Саюза І. Казінца. Спаборніцтвы кожны год збіраюць шэсць мацнейшых студэнцкіх баскетбольных зборных горада.

## ● СПАРТЫЎНАЕ АРЫЕНТАВАННЕ

Закончылася першынство універсітэта па гэтаму цікаваму віду спорту. Спаборніцтвы праходзілі ў маляўнічым месцы ля прыгараднай станцыі «Зялёнае».

Месцы сярод факультэтаў размеркаваліся наступным чынам (у дужках—колькасць набраных ачкоў):

| | | |
|---|---|---|
| 1. | Фізфак | 180 |
| 2. | ФПМ | 150 |
| 3. | Мехмат | 120 |
| 4. | Гістфак | 90 |
| 5. | Біяфак | 80 |
| 6. | Хімфак | 70 |
| 7. | Геафак | 60 |
| 8. | Радыёфізікі і электронікі | 50 |
| 9. | Юрфак | 40 |
| 10. | Філфак | 30 |

Факультэт журналістыкі ў спаборніцтвах не ўдзельнічаў з-за адсутнасці каманды.

● БАСКЕТБОЛ

# Відавочная перавага

НА ПРАЦЯГУ СЯМІ дзён у спартыўнай зале галоўнага корпуса праходзіла першынство універсітэта па баскетболу сярод жаночых факультэцкіх зборных.

З першых жа гульняў было відавочна, што пераможцам першынства стане зборная хімічнага факультэта. І гэта невыпадкова, бо ў састаў валейбольнай каманды хімфака ўваходзілі тры спартсменкі, якія гуляюць за зборную універсітэта. Гэта першакурсніца Аксана Пугачова, Ірына Дароўская (III курс) і выпускніца факультэта Наталля Гузняк. У фінальнай гульні з камандай мехмата спартсменкі хімфака ўпэўнена перамаглі з лікам 46 : 30 і сталі чэмпіёнамі. Трэцяе месца занялі спартсменкі фізічнага факультэта.

Некалькі слоў хочацца сказаць аб якасці правядзення саміх спаборніцтваў. Пажаданне: каб у будучым першынство універсітэта па баскетболу адкрывалася ўрачыстым парадам, а каманды-пераможцы ўзнагароджваліся нават медалямі; каб у кожнай каманды была свая пэўная спартыўная форма. Трэба ўжо зараз вырашыць пытанне падрыхтоўкі суддзяў з ліку студэнтаў, дзеля чаго трэба рэгулярна праводзіць спецыяльныя семінары па суддзейству.

**В. ШХІНЬЯН,**
**выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту.**







● ВОДНЫ ТУРЫЗМ

# ЧАРАМОШ-81

ЧАТЫРЫ ГАДЫ назад ва універсітэце была створана секцыя воднага турызму. Гэтыя чатыры гады сталі перыядам яе станаўлення. Пастулова ўмацавалася матэрыяльная база, рос вопыт яе членаў: падрыхтаваны кадры турыстаў-воднікаў, якім зараз па плячы самыя сур'ёзныя маршруты. І вось вясной было вырашана прайсці па самай складанай рацэ Карпат — Чорнаму Чарамошу.

Чарамош цячэ па Букавіне — краю маляўнічых гор, краю легендарных карпацкіх плытагонаў-бакарашаў. Колькі разоў кадры кінахронікі давалі магчымасць убачыць, як смела гналі яны караваны плытоў па рачных быстрынях, праз парогі і перакаты. Але зараз сплаў па Чарамошу спынены, бо ён наносіў шкоду рацэ і ўсёй навакольнай прыродзе гэтага краю. Цяпер толькі турысты-воднікі выходзяць паспрачацца з наравістай ракой. І пераўтварыўся Чарамош у выдатны прыродны стадыён.

У перыяд майскіх свят група з універсітэта ў саставе 12 чалавек, аснову якой склалі супрацоўнікі НДІ прыкладных фізічных праблем імя А. Н. Сеўчанкі, прайшла гэты цікавы і складаны маршрут. За 10 дзён пройдзена 25 парогаў, мноства шывер і перакатаў. Рака, скорасць цячэння якой часам перавышала 20 кіламетраў у гадзіну, прад'явіла да нас сур'ёзныя патрабаванні. Магутныя метровыя валы часам цалкам захліствалі нашы плыты, і трэба было праявіць выдатныя вытрымку і майстэрства, каб з гонарам выйсці з гэтых сітуацый. Тут спатрэбіўся ўвесь наш вопыт, набыты на рэках Карпат і Карэліі, дапамагла сур'ёзная падрыхтоўка ў зімовы перыяд.

Але паход — гэта не толькі парогі і горныя круцізны. Шмат цікавых сустрэч адбылося ў Карпатах. Група пабыла ў гасцях у хлебаробаў калгаса «Карпаты» Верхавінскага раёна. Ім былі прачытаны лекцыі аб дасягненнях, аб гаспадарчым развіцці БССР. Турысты азнаёміліся з непаўторным мастацтвам гуцульскіх народных умельцаў, з незабываемай драўлянай архітэктурай карпацкіх вёсак. У час паходу праводзіліся і навуковыя даследаванні. Па заданню НДІ водных рэсурсаў былі праведзены натурныя выпрабаванні распрацаванай апаратуры для вымярэння хуткасцей патокаў вадкасці. Вынікі выпрабаванняў будуць укаранёны ў практыку.

**Ф. ЕРМАЛІЦКІ,**
**малодшы навуковы супрацоўнік НДІ ПФП.**



БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

4 чэрвеня 1981 г.

АТ 02306 Заказ 941.

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14. ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЁЎ